*Т. І. Цяцеркіна, В. У. Корсак*

# ПРАСТОРАВА-ЧАСАВАЯ ТЭОРЫЯ ПСІХІЧНАГА ЗДАРОЎЯ І ЯГО РАССТРОЙСТВАЎ: АСНОЎНЫЯ ТЭАРЭТЫЧНЫЯ ПАЛАЖЭННІ

*ДУ «Рэспубліканскі навукова-практычны цэнтр псіхічнага здароўя», НМУ Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта «Рэспубліканскі цэнтр праблем чалавека»*

*Аўтарамі прадстаўлена тэорыя аб адпаведнасці індывідуальных прасторы і часу чалавека параметрам знешняга свету як умовы яго псіхічнага здароўя, неканкардантнасць з якімі выклікае фундаментальныя змены свядомасці, што прыводзяць да псіхічных расстройстваў.*

**Ключавыя словы:** *індывідуальныя прастора і час, мадэлі свядомасці, псіхічныя расстройствы.*

*T. I. Tsiatserkina, V. U. Korsak*

# THE SPATIO-TEMPORAL THEORY OF MENTAL HEALTH AND ITS DISORDERS: THE BASIC THEORETICAL PROVISIONS

*The theory on the appropriation of individual space and time of man to parameters of the external world is a prerequisite for mental health, nonconcordance with which causes the fundamental changes in concsciousness leading to mental disorders, is represented by authors.*

**Key words:** *individual space and time, consciousness models, mental disturbances.*

Нягледзячы на няспыннае імкненне навукоўцаў і клініцыстаў спасцігнуць прыроду парушэнняў псіхікі чалавека, даводзіцца канстатаваць, што адзінай агульнапрынятай тэорыі псіхічных расстройстваў дагэтуль не існуе. Неабходнасць яе распрацоўкі дыктуецца адсутнасцю яснага ўсведамлення галоўных механізмаў фарміравання псіхічных парушэнняў у цэлым і кожнага расстройства паасобку, трансфармацыі сімптомаў у межах асобных назалагічных формаў пры пераходзе адных псіхічных расстройстваў у іншыя. Ад разумення гэтых вынікаў залежыць правільная пастаноўка дыягназу, дыферэнцыйная дыягностыка

расстройстваў, перыядызацыя і змест лячэння, клінічны прагноз і г.д.

У апошнія дзесяцігоддзі актыўна вядуцца даследаванні псіхічнай паталогіі на генетычным, марфалагічным, біяхімічным, нейрапсіхалагічным, псіхасацыяльным, клінічным узроўнях. Аднак пры распрацоўцы асобных тэарэтычных палажэнняў вучонымі амаль не закранаецца той асноўны, адзіны для ўсіх псіхічных расстройстваў узровень – прасторава-часавы, дзе ўзнікаюць карэнныя для псіхічнага функцыянавання зрухі, якія мяняюць спосаб існавання чалавека ў навакольным асяроддзі. Існуючыя даследаванні маюць дачыненні выключна да парушэнняў хронарытмічнай арганізацыі чалавека, дзе гаворка вядзецца пра цыклічнасць фізіялагічных працэсаў і іх асацыяцыі з афектыўнымі расстройствамі [5; 6; 8]. Нават у Бюлетэні Сусветнай псіхіятрычнай асацыяцыі, дзе ў аналізе аднаго з іх – дэпрэсіі – час як такі выведзены на першае месца, не робіцца адрозненняў паміж яго ўспрыманнем і часам, у якім у сваіх перажываннях знаходзіцца пацыент [7]. Між тым, выдзяленне прасторы і часу як прыналежных чалавеку сутнасцяў, якія не зводзяцца да асобнай, хаця і вельмі важнай, псіхічнай функцыі іх ўспрымання, мае канцэптуальнае значэнне.

Усе аб'екты свету, што развіваюцца, маюць свае прастору і час. Не з'яўляецца выключэннем сярод іх чалавек з яго індывідуальнымі прасторай і часам. Сістэмнае вывучэнне апошніх было пачата Н. Н. Брагінай і Т. А. Дабрахотавай шляхам даследавання латэральных функцыянальных асіметрый і звязанай з імі прасторава-часавай арганізацыі псіхічнай дзейнасці здаровых людзей і пацыентаў з лакальнымі паражэннямі галаўнога мозгу. Індывідуальныя прастора і час чалавека разглядаюцца імі ў плане права-левай няроўнасці індывідуальнай прасторы і асіметрыі мінулага і будучага часу. Аўтарамі выказана найважнейшае для нашых далейшых разважанняў палажэнне аб тым, што індывідуальныя прастора і час існуюць у непарыўным адзінстве з прасторай і часам знешняга свету і суадносяцца з імі [1]. Але самі індывідуальныя прастора і час як аб'екты знешняга свету, што існуюць ва ўсіх, не толькі ў гарызантальных, каардынатах, дагэтуль не вывучаліся.

Прастора і час – гэта фундаментальныя паняцці, якія з даўніх пор лічыліся амаль выключна філасофскімі. На наш погляд, наспела неабходнасць асэнсавання іх значэння і ў псіхіятрыі, паколькі пры псіхічных расстройствах змяненні індывідуальнага свету пацыентаў з'яўляюцца абавязковымі.

**Мэта** дадзенай працы – паказаць вызначальную ролю індывідуальных прасторы і часу чалавека ў фарміраванні псіхічнага здароўя і яго расстройстваў.

**Задачы даследавання:**

1) вывучыць структуру індывідуальнай прасторы і функцыянаванне індывідуальнага часу ў здаровых і пацыентаў з псіхічнымі расстройствамі,

2) высветліць суадносіны індывідуальных прасторы і часу са свядомасцю чалавека і паказаць магчымасць мадэлявання апошняй,

3) раскрыць сутнасць псіхічных расстройстваў і дынамікі іх развіцця праз вывучэнне прасторава-часавых мадэляў свядомасці.

**Матэрыялы і метады** з'яўляюцца агульнымі для усёй серыі артыкулаў, у якіх раскрываюцца палажэнні вылучанай аўтарамі прасторава-часавай тэорыі.

Аб'ектамі даследавання з'явіліся індывідуальныя прастора і час, а таксама звязаная з імі свядомасць здаровых людзей, у тым ліку – выканаўцаў традыцыйных апатрапеічных (аберагальных) рытуалаў, а таксама пацыентаў з псіхічнымі расстройствамі: біпалярным афектыўным, абсесіўна-кампульсіўным, шызафрэніяй, дэменцыяй і інш.

Матэрыяламі для вывучэння паслужылі вынікі нашых шматгадовых назіранняў за здаровымі людзьмі адносна іх функцыянавання ў прасторы і часе, асабліва ў сувязі з цыклам сон–няспанне, вывучэння традыцыйных тэкстаў–прадпісанняў для рытуальна-магічнай дзейнасці, якія адлюстроўваюць змененыя станы свядомасці яе суб'ектаў, а таксама асаблівасцяў парушэння свядомасці пры псіхічных расстройствах. Даследаванні здаровых і пацыентаў праводзіліся выпадковай выбаркай (апошніх – безадносна да формы захворвання) ва ўстановах, якія прадстаўляюць аўтары дадзенай працы.

Галоўным метадалагічным падыходам да вывучэння зменаў свядомасці абраны агульнанавуковы прынцып сіметрыі, прызнаны «асноўным прынцыпам пазнання існага» [2], які рэалізуецца праз прастору і час. Прынцып сіметрыі, што выкарыстоўваўся намі раней пры вывучэнні некаторых характарыстык свядомасці пацыентаў з шызафрэніяй, апынуўся, на наш погляд, дастаткова плённым [4].

Для вывучэння парушэнняў прасторава-часавай арганізацыі свядомасці пацыентаў з рознымі назалагічнымі формамі псіхічных расстройстваў асноўным быў метад клінічнага назірання.

Прататыпамі для вывучэння індывідуальных прасторава-часавых змен, на наш погляд, можна лічыць тыя, што адбываюцца ў здаровых суб'ектаў магічных рытуалаў, здзяйсняючы якія людзі імкнуцца змяніць «сусветны парадак». Падчас рытуальна-магічных дзеянняў адбываюцца зрухі свядомасці іх выканаўцаў, якія выражаюцца ў рознай ступені дэрэалізацыі рэчаіснасці. Аналіз гэтых змен набліжае да разумення таго, якім чынам мяняецца свядомасць чалавека пры псіхічнай паталогіі.

Як паказана ў працах В. У. Корсак, у свядомасці здаровых суб'ектаў, што здзяйсняюць апатрапеічныя рытуалы, пры адчуванні вонкавай небяспекі выступаюць тры прасторава-часавыя сферы: 1) ідэальная; 2) абыдзённая, блізкая да рэальных прасторы і часу знешняга свету і 3) дэфармаваная, скажоная [3].

Акрамя таго, у свядомасці чалавека з магічным складам мыслення могуць праяўляцца дадатковая гіпербалізаваная сфера і супрацьлеглая ёй – мінімізаваная, прататыпамі якіх можна лічыць прадукавальную магію. Суб'екты апошняй нібыта валодаюць здольнасцю надаваць сілу і іншыя надзвычайныя здольнасці чалавеку ці пазбаўляць іх, змяняючы яго індывідуальныя прастору і час.

Пры здзяйсненні магічных апатрапеічных рытуалаў у свядомасці чалавека адбываецца пераразмеркаванне адзначаных прасторава-часавых сфер, калі доля рэальнай змяншаецца, большую значнасць набываюць ідэальная, дэфармаваная і гіпербалізаваная (або мінімізаваная) сферы.

У пацыентаў з псіхічнымі расстройствамі адбываецца замяшчэнне індывідуальнай абыдзённай сферы пералічанымі вышэй або дэзактуалізацыя і нівеляванне індывідуальных прасторы і часу.

У выніку праведзенага аналізу намі сфармуляваны асноўныя палажэнні прасторава-часавай тэорыі псіхічнага здароўя і яго расстройстваў:

1. Індывідуальныя прастора і час чалавека ўяўляюць сабой аб'ект знешняга свету, які падпарадкоўваецца законам апошняга.

2. Адпаведнасць індывідуальных прасторы і часу прасторава-часавым параметрам знешняга свету з'яўляецца ўмовай псіхічнага здароўя чалавека.

3. Індывідуальная прастора чалавека мае характэрную канструкцыю, а індывідуальны час – траекторыю і вектар руху, што робіць магчымым іх мадэляванне ў свядомасці.

4. Праз індывідуальныя прасторава-часавыя мадэлі рэалізуецца вядучая роля свядомасці ў арганізацыі псіхічных працэсаў.

5. Пры значных змяненнях індывідуальных прасторы і часу ўзнікае іх неканкардантнасць з прасторава-часавымі параметрамі знешняга свету, што прыводзіць да фундаментальных перабудоў (ажно да дэструкцыі) свядомасных прасторава-часавых мадэляў.

6. У выніку парушаецца або губляецца арганізуючая роля свядомасці ў дачыненні да псіхічных працэсаў чалавека, з чаго вынікаюць расстройствы яго псіхічнага функцыянавання.

Гэтыя палажэнні будуць развіты ў серыі наступных падрыхтаваных намі навуковых прац.

На думку аўтараў, прапанаваная прасторава-часавая тэорыя, дзякуючы фундаментальнаму падыходу для яе распрацоўкі, будзе мець значэнне для пэўнага пераасэнсавання сутнасці псіхічных расстройстваў, што паспрыяе правільнай пастаноўцы дыягназу, дыферэнцыйнай дыягностыцы расстройстваў, іх перыядызацыі і клінічнаму прагназаванню, а таксама аптымізацыі лячэння.

**Літаратура**


1. *Брагина, Н. Н.*, Доброхотова, Т. А. Функциональные асимметрии человека / Н. Н. Брагина, Т. А. Доброхотова. – М.: Медицина, 1981. – 288 с.
2. *Вернадский, В. И.* Размышления натуралиста: Пространство и время в живой и неживой природе / В. И. Вернадский / Под ред. Н. Ф. Овчинникова. – М., 1975. – М.: Наука. – 174 с.
3. *Корсак, В. У.* Таямніцы беларускіх абярэгаў / В. У. Корсак. – Мінск: Беларусь, 2013. – 232 с.
4. *Принцип* симметрии в изменениях сознания субъектов магических апотропеических ритуалов и пациентов с шизофренией / Т. И. Тетеркина [и др.] // Рос. психиатрич. журн. – 2014. – № 2. – С. 55–62.
5. *Хильденбрандт, Г.,* М. Мозер, М. Леховер. Хронобиология и хронобиологическая медицина / Г. Хильденбрандт [и др.] / Пер. с нем.; под ред. С. Н. Мосолова. – М.: Арнебия. – 144 с.
6. *Хронобиологическая* теория аффективных расстройств / Под ред. С. Н. Мосолова – М.: АВАНПОРТ, 2014. – 352 с.
7. *Depression* and time // WPA Bulletin on Depression. – 2015. – Vol. 19. – № 52. – 12 p.
8. *Zulley, J.,* Crönlein T., Longwieder K. Einschlafen am Steuer Hauptursoche schwerer Verkehrsunfalle / J. Zulley, T, Crönlein, K, Longwieder // WMW. – 1995. – № 145. – 475 s.


*Поступила 16.03.2016 г.*